**А. Сяцько**

# ПРАБЛЕМА КАНСАЛІДАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ ГОМАНАЎЦАЎ

У канцы XIX ст. беларусы мелі наступныя перадумовы нацыянальнай кансалідацыі: этнічная і моўная асновы, тэрыторыя, культурныя і бытавыя сувязі. Сёння мы можам назіраць такі этап развіцця беларускай нацыі, калі культурная ідэнтыфікацыя пераважае над нацыянальнай: людзі абапіраюцца не на гісторыю, фальклёр і т.п., каб аднесці сябе да беларусаў, а на сваё пражыванне ў Беларусі, на любоў да самой культуры і «малой радзімы».

Гоманаўцы былі першымі, хто заявіў аб самабытнасці беларускага народа і тэарэтычна абаснаваў яго існаванне. Чаму яны пачалі гэтую працу? Гоманаўцы лічылі, што моцныя абласныя аўтаноміі дадуць апору рэвалюцыянерам сацыялістычнай партыі, якія зменяць існуючы лад. Стварыць абласную аўтаномію на Беларусі народнікі вырашылі на базе нацыянальнай свядомасці.

Група «Гоман» амаль першая пачала выкарыстоўваць тэрміны *Белоруссия*, *белорусы*. Адсюль бачны ўплыў Расіі на захоплены ў выніку падзелаў РП беларускі народ і беларускую інтэлігенцыю.

Гоманаўцы адзначалі асноўныя перашкоды на шляху кансалідацыі беларускай нацыі: палітыку паланізацыі і русіфікацыі пасля падзелаў РП.

У іх публікацыях ёсць з чым не пагадзіцца. Гоманаўцы пішуць, што Маларосія мае больш шанцаў на атрыманне самастойнасці з-за прасякнутасці інтэлігенцыі нацыянальнай ідэяй, і калі беларуская інтэлігенцыя таксама наблізіцца да народа, такое становішча будзе і ў Беларусі. Яны не ўлічваюць, што Заходняя Украіна ўваходзіла ў склад Аўстрыйскай імперыі, якая ніколі не перашкаджала кансалідацыі ўкраінскай нацыі, і найбольш вядомыя культурныя дзеячы выходзілі менавіта з Заходняй Украіны. На мой погляд, народнікі не маглі дасягнуць інтэграцыі беларускай нацыянальнай супольнасці толькі хаджэннем у народ і збліжэннем з сялянамі. Пытанне гэтае з'яўляецца больш глыбокім.

Наконт таго, адкуль узнікла ідэя неабходнасці хаджэння ў народ, гоманаўцы тлумачаць тым, што беларуская інтэлігенцыя выходзіць з класу палякаў-памешчыкаў або з чыноўнікаў, якія не маюць нічога агульнага з сялянамі. Але што паспрыяла аддаленню ў адносінах паміж сялянствам і інтэлігенцыяй на Беларусі? На мой погляд, гэта: а) паланізацыя і акаталічванне шляхты; б) недахоп адукацыі сярод пераважнай большасці насельніцтва і адсутнасць цесных культурных і бытавых сувязей паміж горадам і вёскай.

Такім чынам, гоманаўцы называюць сябе беларусамі, рэвалюцыянерамі, сацыялістамі. Іх дзейнасць не прывяла да звяржэння самадзяржаўя, да змены ладу жыцця краіны. Але галоўная мэта была дасягнута: яны разварушылі беларускую інтэлігенцыю, з іх трыбуны прагучаў заклік да змагання за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа. Публікацыі «Гомана» – гэта вельмі важныя дакументальныя помнікі таго часу, з якіх мы можам рабіць высновы аб тэарэтычным узроўні беларускіх народнікаў, іх мэтах і задачах, аб праблемах, якія імі ставіліся, аб саюзе гоманаўцаў з «Народнай воляй».